11 Справки о порядке удовлетворения денежным довольствием лиц, эвакуированных с театра военных действий и о выдаче пособий за утерянное имущество раненым офицерам, врачам, военным чиновникам и священнослужителям // НИАБ. – Ф. 2708. – Оп. 1. – Д. 2.

12 Плоткин, Л. Могилев: белый платочек и крест на груди [Электронный ресурс] / Л. Плоткин // История Могилёва. – 2015. – 6 августа. – URL: http://masheka.by/history_mogilev/istoriya-stavka-v-mogileve/786-mogilevbelyy-platochek-i-krest-na-grudi.html (дата обращения: 11.02.2016)

13 Гомель и гомельчане в период Первой мировой войны (1914–1918): тематический обзор / сост. Л. Н. Шилова ; отв. Т. С. Власова. – Гомель: ГУ «Гомельская центральная городская библиотека им. А. И. Герцена», 2014. – 32 с.

14 Черепица, В. Н. Город-крепость Гродно в годы Первой мировой войны: мероприятия гражданских и военных властей по обеспечению обороноспособности и жизнедеятельности / В. Н. Черепица. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – 535 с.

**УДК 903.08:39:677.074(476.2-37Акцябрскі)“19”**

***В. В. Гардзей***

## УПРЫГОЖВАННЕ БЕЛАРУСКІХ ТРАДЫЦЫЙНЫХ ТКАНІН У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 20 ст. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ АКЦЯБРСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ)

*Артыкул прысвечаны ўпрыгожванню традыцыйных тканін у Акцябрскім раёне ў другой палове 20 ст. Разгледжаны асноўныя спосабы ўпрыгожвання ручнікоў, абрусоў і посцілак, іх каларыстычная гама, узоры і арнамент. Вызначаны пэўныя мясцовыя адрозненні і асаблівасці. Асобная ўвага надаецца дэкаратыўным тканым вырабам, якія вызначаюцца найбольшай прыгажосцю і раней служылі менавіта для ўпрыгожвання інтэр’ера.*

Мастацкае ткацтва здаўна з’яўляецца неад’емнай часткай матэрыяльнай культуры Акцябршчыны. Вытканыя ў клетку, ромбамі, шасцівугольнікамі і іншымі геаметрычнымі малюнкамі, мастацкія вырабы з’яўляліся неабходнымі рэчамі ў сялянскім інтэр’еры [1, с. 450]. Своеасаблівы пік ткацтва ў вёсках Акцябрскага раёна прыйшоўся на 1970–1980 гг. Традыцыйнае валоданне ткацкім рамяством дазваляла жанчынам пры адсутнасці ў продажу патрэбных тавараў задавальняць уласнымі сіламі патрэбы ў тканых вырабах. Шматлікія тэхнічныя прыёмы ткацтва і вышыўкі атрымалі сваё ўвасабленне ў разнастайных вырабах утылітарнага, дэкаратыўнага і абрадавага прызначэння – ручніках, абрусах, посцілках, дыванах. Традыцыйныя тканіны вызначаюцца мастацкасцю арнаментацыі, прыгажосцю колеравых спалучэнняў, высокім майстэрствам выканання, аздобай і іншымі тэхнікамі, што вызначае іх непаўторнасць [2, с. 494].

Упрыгожванне традыцыйных тканін у Акцябрскім раёне было адным з важных пытанняў вывучэння народнага ткацтва падчас этнаграфічнага даследавання аўтара ў 2016 г., атрыманыя матэрыялы паслужылі асновай дадзенага артыкула. Асноўны акцэнт у даследаванні быў здзейснены таксама на выяўленні і аналізе крыніц. Вывучэннем мастацкага ткацтва беларусаў займаліся этнографы і мастацвазнаўцы Г. М. Курыловіч, В. А. Лабачэўская, В. Я. Фадзеева, Я. М. Сахута і інш. Аздабленне традыцыйных тканін з’яўляецца асобным аспектам вывучэння ў іх працах. Аднак пры наяўнасці вялізнага кола крыніц па мастацтвазнаўству і этнаграфіі, якія распавядаюць аб народным ткацтве беларусаў увогуле, рэгіянальны аспект па дадзеных Акцябршчыны дастаткова вузкі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У вырабе мастацкіх тканін у Акцябрскім раёне ў другой палове 20 ст. упрыгожванню і аздабленню належыла асаблівае значэнне. Кожная ткачыха ставілася да гэтай працы з вялікай стараннасцю, бо падчас вырабу тканін яна складала свае непаўторныя ўзоры, у якіх адлюстроўвала свой лёс, пачуцці, уражванні. Гэта сведчыць аб тым, што ў традыцыйных тканінах знаходзіў адлюстраванне ўвесь светапогляд народнай ткачыхі, які перадаваўся шляхам аздаблення мастацкіх вырабаў. Выразная дэкаратыўнасць і прыгажосць мастацкіх тканін сведчыла аб вялікім узроўні і майстэрстве ткачыхі і вылучала яе сярод другіх майстрых.

Выразнасць і адметнасць традыцыйным тканінам Акцябршчыны надаюць разнастайныя ўзоры, арнамент, колер, іх аздабленне. Кожны з гэтых элементаў з’яўляецца часткай упрыгожвання мастацкіх вырабаў. Узоры, вытканыя на мастацкіх тканінах складаліся ў залежнасці ад выбранага прыёма ткацтва. Некаторыя тканіны адразу ткаліся пэўным ўзорам, другія ўялялі сабой звычайнае палатно, якое пасля аздаблення вышыўкай і карункамі прымала завершаны выгляд.

Адным з найбольш распаўсюджаных традыцыйных вырабаў у другой палове 20 ст. з’яўляўся ручнік. Ручнікі ўтылітарнага прызначэння амаль не ўпрыгожваліся і былі шэрага колеру, што тлумачылася натуральным колерам неадбеленага льну. Толькі часам на канцах меліся дзве–тры палоскі чырвонага колеру. Найбольшай прыгажосцю вызначаліся дэкаратыўныя ручнікі. Яны служылі не толькі для ўпрыгожвання інтэр’ера, а мелі і шырокае абрадавае прызначэнне [3, с. 54]. Ткаліся ручнікі галоўным чынам з папярочным і падоўжным размяшэннем узору. У папярочна-паласатых ручніках узор часцей размяшчаўся на канцах і ўяўляў сабою шырокія папярочныя арнаментаваныя палосы, якія чаргаваліся з больш вузкімі палоскамі. Для гэтых ручнікоў характэрны геаметрычны арнамент. Нярэдка ўзор займаў усё поле. Канцы арнаментаваліся больш насычана, а сярэдзіна – вузкімі чырвонымі палоскамі. У ручніках з падоўжным размяшчэннем малюнка арнаментальныя кампазіцыі больш разнастайныя: геаметрычныя (ромбы, зоркі), раслінныя (галіны раслін, кветкі) і шырока пашыраныя арнітаморфныя матывы (“птушкі”) з выявамі галубоў, радзей пеўняў, якія размяшчаліся адзін на супраць другога. Ручнікі з падоўжным размяшчэннем узору адрозніваюцца мяккасцю малюнка, тонкасцю і вытанчнасцю. Некаторыя ручнікі часта ўпрыгожваліся дзвюма-трыма чырвонымі палоскамі. Для многіх ручнікоў была характэрна нескладаная клетчатая кампазіцыя. Размяшчэнне іх у гарызантальным, вертыкальным ці нахільным напрамку стварала разнастайныя ўзоры. Узор у іх складаўся галоўным чынам з квадратаў, зваўся “ў шашкі” і часцей сустракаўся на абрусах [4, с. 172]. Распаўсюджанымі былі ручнікі, для якіх характэрным быў раслінны арнамент (“вазоны”). Трэба адзначыць, што ўзоры часцей складалі самі ткачыхі, пераймалі ад сваіх матуль і бабуль, ад суседзяў.

У побыце шырока выкарыстоўваліся абрусы ці “настольнікі”. Для паўсядзённых, “на кожны дзень”, выкарыстоўвалася грубейшая пража і ткаліся яны нескладаным спосабам, святочныя вырабы ткаліся з тонкіх нітак і па тэхніцы былі больш разнастайныя. Абрус упрыгожвалі вышываным, набіваным арнаментам, карункамі, махрамі [5, с. 16]. Вылучаюцца святочныя ўзорыстыя абрусы з каляровымі (пераважна чырвонымі) гладкімі ці арнаментальнымі палосамі па краях. Малюнак у іх ствараўся шэрымі і белымі ніткамі, узор геаметрычны – у “шашачкі”, у выглядзе прамавугольнікаў (“клеткі”), пялёсткаў (“зоркі”). Аднак у другой палове 20 ст. каларыстычная гама абрусоў пашыраецца выкарыстаннем яркіх колераў. У в. Любань народная ткачыха Шэўка Надзея Лук’янаўна, 1937 г.н., вырабляла абрусы з набіванымі на выбеленым палатне рознакаляровымі ружамі і аздобленымі на канцах махрамі.

Значную ролю ва ўпрыгожванні інтэр’ера мела ўбранне пасцелі. З адметнай стараннасцю прыбіралі яе ў святочныя дні. Ложак абавязкова засцілалі лёгкімі саматканымі посцілкамі. У адрозненні ад іншых мастацкіх тканін, посцілкі вылучаюцца разнастайнасцю ўзораў і колеравай гамы. Для іх характэрны як геаметрычны, так

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і расліны арнамент. Найбольш распаўсюджанымі ўзорамі посцілак з'яўляліся прамавугольнікі, ромбы, клетка ці палосы. З выкарыстаннем геаметрычнага арнаменту вылучаюцца посцілкі, узоры якіх складаюць ромбы са змешчанымі ў сярэдзіне іх васьміпялёсткавыя разеткі ("зоркі"). Такі ўзор быў распаўсюджаны амаль ва ўсім раёне. Шмат посцілак складаюць раслінныя ўзоры: кветкі, дубовае лісце, кляновае лісце, галінкі бэзу, вазоны і г. д. Дзякуючы шматкаляровым ніткам посцілкі рабіліся багацей і разнастайней па каларыце. Часам у посцілцы налічвалася да пяці і больш колераў. Краі посцілак звычайна былі зарублены на канцах. Выкарыстанне разнастайных узораў і каларыстычных матываў і складала галоўнае ўпрыгожванне посцілак. Аднак у сваёй практыцы народная ткачыха в. Любань Ахраменка Таццяна Андрэеўна, 1926 г.н., выкарыстоўвала вышыўку для аздаблення посцілак. Напрыклад, процягам яна па контуру вышывала геаметрычныя ўзоры посцілак. Тканыя посцілкі народнай ткачыхі в. Дзербін Ахраменка Ніны Сямёнаўны, 1935 г.н., адрозніваюцца яркімі каларыстычнымі матывамі з выразным кветкавымі ўзорамі.

Шырока вядомы і саматканыя дываны. Тэрмінам "дываны" даволі часта называлі і звычайныя посцілкі. Тлумачылася гэта аднолькавым спосабам ткання. Характэрным быў выраб дываноў з раслінным ці геаметрычным арнаментам. Часам на дыванах былі адлюстроўваны не проста ўзоры, а нават разнастайныя сюжэты. Дываны звычайна вешалі на сцены над ложкам. Часам канцы маглі ўпрыгожвацца карункамі.

Выкарыстоўваліся ў побыце дарожкі для падлог ("палавікі"). Дарожкі ткаліся пераважна з пражы самай нізкай якасці. Дарожкі былі нешырокімі і вельмі доўгімі. Ткалі іх звычайна ў папярочную ці падоўжную палоску. Выкарыстоўвалі таксама геаметрычны ўзор у прамавугольнікі, клетку, ромбы. Дарожкі звычайна не ўпрыгожваліся і мелі зарубленыя канцы.

Найбольш распаўсюджанымі спосабамі ўпрыгожвання традыцыйных тканін з'яўляліся вышыўка, аздоба карункамі, набіванне. Важнае месца ў аздабленні ручніка належыць менавіта вышыўцы, не менш багатай па спосабах выканання і арнаментальным вырашэнні, чым ткацтва. Традыцыйнымі спосабамі арнаментацыі ручнікоў з'ўлялася вышыўка процягам, гладдзю, крыжыкам. Вышывалі часцей за ўсё пакупнымі баваўнянымі ніткамі, якія мелі розныя колеры. У другой палове 20 ст. масавае распаўсюджванне набыла паліхромная вышыўка гладдзю. Рознакаляровыя букеты, гірлянды з кветак з'явіліся на накідках, навалачках, шторах. Вышыўку гладдзю выкарыстоўвалі таксама пры аздабленні ручнікоў і абрусоў. Было распаўсюджана і вышыванне крыжыкам. Не менш удала майстрыхі валодалі і балгарскім крыжыкам. Шырокае распаўсюджванне вышыўка атрымала амаль ва ўсіх вёсках Акцябрскага раёна. Вышытыя крыжыкам у асноўным раслінным арнаментам ручнікі і падузорнікі, гладдзю – абрусы і навалачкі можна было бачыць у кожнай сялянскай хаце, дзе гаспадарыла сапраўдная майстрыха. Ткачыхі смела ўводзілі ў колеравую гаму зялёны, жоўты, сіні, ружовы колеры, узбагачалі раслінны арнамент рознымі кампазіцыямі. Трэба адзначыць, што ў другой палове 20 ст. найбольшую папулярнасць атрымалі вышытыя ручнікі. Народныя ткачыхі Акцябрскага раёна захоўваюць вялікую колькасць вышываных ручнікоў. Найчасцей мастацкія тканіны ўпрыгожвалі разнастайныя ўзоры кветак. Галоўная асаблівасць аздаблення вышыўкай з'яўляецца тое, што ёй упрыгожваліся амаль усе тканіны. Народнай ткачыхі в. Любань, Шпак Кацярыне Ігнацьеўне, 1930 г.н., вельмі падабалася вышываць прастыні, якіх захавалася больш за трыццаць. Вышывала яна і платкі, узор для якіх у асноўным складала з кветачак і галінак.

Мастацкае аздабленне ручніка завяршалася афармленнем яго ніжняга краю. Найбольш распаўсюджаным тыпам дэкору канцоў з'ўляліся карункі, якія ўяўлялі сабой ажурныя сятчастыя вырабы. Амаль ва ўсіх ручніках канцы ўпрыгожвалі вязанымі карункамі. Узоры на іх былі самыя разнастайныя: клетачкі, кружкі, ромбы, ружы. Карункі закончваліся звычайна зуб'ямі. Карункамі маглі аздабляцца таксама абрусы,

РЕПОЗИТОРИЙ УНИВЕРСИТЕТА ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

накідкі на пасцель, "занавескі". Для завяршэння такіх мастацкіх тканін як ручнікі і абрусы шырока выкарыстоўвалі махры, якія ўяўлялі сабой распушчаныя па канцах ніткі. Распаўсюджванне гэтага спосаба ўпрыгожвання абумоўлена яго нескладаным вырабам.

Адным з тыпаў аздаблення мастацкіх тканін з'яўлялася набіванне. Такі спосаб аздаблення, напрыклад для ўпрыгожвання абрусоў, выкарыстоўваўся непасрэдна ў адной з тэхнік ткацтва. Арнаментальныя кампазіцыі такога спосабу ўпрыгожвання звычайна складаліся з буйных раслінных матываў.

Такім чынам, у вырабе мастацкіх тканін у Акцябрскім раёне ў другой палове 20 ст. вялікае значэнне мела іх упрыгожванне. Найбольшай прыгажосцю адзначаліся дэкаратыўныя і абрадавыя тканіны, якія выкарыстоўваліся для ўбрання хатняга інтэр'ера і ў традыцыйнай абраднасці. Да мастацкіх тканін, якія вызначаліся шырокім выкарыстаннем дэкаратыўных прыёмаў адносіліся ў першую чаргу ручнікі і абрусы, меней посцілкі і дарожкі. Рознымі спосабамі аздаблення народныя ткачыхі ўпрыгожвалі таксама навалачкі, прастыні, накідкі, платкі, занавескі. Асноўныя элементы аздаблення тканых вырабаў складаліся з вышыўкі, карункапляцення і набівання. Упрыгожванне традыцыйных тканін сведчыла аб высокім узроўні і майстэрстве народных ткачых, пры гэтым у аздабленні мастацкіх вырабаў адлюстроўваліся іх адметныя рысы і асаблівасці.

**Літаратура**

1 Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Акцябрскага раёна / Г. К. Кісялёў [і інш.]. – Мінск: БЕЛТА, 1997. – 478 с.

2 Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Бел СЭ, 1984–1987. – Т. 5: Скамарохі – Яшчур / І. П. Шамякін [і інш.]. – 1987. – 703 с.

3 Лабачэўская, В. Повязь часоў – беларускі ручнік / В. Лабачэўская. – Мінск: Беларусь, 2002. – 231 с.

4 Фадзеева, В. Я. Беларускі ручнік / В. Я. Фадзеева. – Мінск: Полымя, 1994. – 327 с.

5 Беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: 2-е выд., перапрац. і дап. / Я. М. Сахута. – Мінск: Беларусь, 2001. – 110 с.

**УДК 930:338.45:335.014.1(47+57) «196/198»**

***Э. Л. Гарцуев***

## ВОЕННО-ПРОМЫШЛЕННЫЙ КОМПЛЕКС СССР В 1960-е – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЕ 1980-х гг.: ВОПРОСЫ ИСТОРИОГРАФИИ

*Статья посвящена историографии Военно-промышленного комплекса СССР. В статье рассмотрен ВПК СССР в отечественной историографии. Показаны хронологические периоды и направления, связанные с проблематикой оборонной промышленности. Дана оценка различных работ советских и российских историков занимавшихся данной проблематикой. Подведены итоги деятельности историков по исследованию ВПК СССР.*

Историография истории военно-промышленного комплекса СССР немногочисленна. В беларусской историографии данная проблема практически не рассматривается. Исследователи, которые занимаются военной историей в целом, изучают Великую Отечественную войну. Среди них следует выделить С. Новикова [1], Е. Павлову [2], А. Литвина [3] и др.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ